# МУЗЕЙНАЕ СВЯТА ЯК ФОРМА РЭВІТАЛІЗАЦЫІ ПАМЯТНАЙ ДАТЫ Ў ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

***Ю. В. Кавалёва,***
*суіскальнік вучонай ступені кандыдата навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*вядучы навуковы супрацоўнік ДУ «Музей гісторыі горада Мінска»*

Музей гісторыі горада Мінска – дзяржаўная ўстанова гарадскога падпарадкавання, створаная ў 2010 г. Развіццё музея адбываецца ў рамках канцэпцыі музеефікацыі аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны г. Мінска. У структуры музея дзейнічаюць два філіялы і сем экспазіцый, большасць з якіх размешчаны ў будынках – помніках архітэктуры на тэрыторыі Верхняга горада.

Музей праводзіць актыўную культурна-адукацыйную дзейнасць. Акрамя традыцыйных форм работы з наведвальнікамі, такіх як экскурсія, лекцыя, выязная лекцыя, развіваюцца і новыя формы асветніцкай работы. Да паспяховых прыкладаў можна аднесці ўжо традыцыйнае музейнае свята – дзень першай летапіснай згадкі пра Мінск – 3 сакавіка 1067 г.

Адной з галоўных задач музея з’яўляецца папулярызацыя гісторыі і культуры г. Мінска сярод самых шырокіх колаў насельніцтва. Рэалізуецца канцэпцыя па рэвіталізацыі памятных гістарычных дат. Найбольш папулярнай формай для вырашэння дадзенай задачы можна назваць музейнае свята.

Існуюць два вядомых азначэння паняцця «музейнае свята». У адпаведнасці з першым, музейнае свята – гэта комплексная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, дзе адзінай тэмай аб’яднаны элементы экскурсіі, творчага вечара, тэатралізаванага прадстаўлення і інш. [4, с. 485]. Нягледзячы на тое, што ў азначэнні раскрыта толькі фармальная характарыстыка з'явы – яе комплексны характар у дачыненні да іншых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, у наступным агавораны галоўныя ўмовы, пры якіх мерапрыемства можна лічыць музейным святам, – музейнасць і святочнасць. Пад святочнасцю разумеецца не толькі забаўляльнасць, але і наяўнасць абраднасці. Музейнасць заключаецца ў тым, што падчас мерапрыемства павінна быць задзейнічана музейная атрыбутыка і ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго аснове павінен ляжаць кваліфікаваны суправаджальны аповед музейнага супрацоўніка.

Другое азначэнне тлумачыць музейнае свята як комплексную форму культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, заснаваную на разнастайных прыёмах актывацыі музейнай аўдыторыі, якія ўзмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне: тэатралізацыя, гульня, прымяненне асаблівай атрыбутыкі, рытуалаў [1, с. 109–110]. Адносна папярэдняга азначэння тут дададзены наступныя характарыстыкі: наяўнасць сцэнарыя, выкарыстанне нерухомых помнікаў гісторыі і культуры, масавасць, актывізацыя аўдыторыі, эмацыянальнае ўздзеянне.

Абапіраючыся на дадзеныя тэарэтычных даследаванняў і вопыт іншых музейных устаноў у правядзенні музейных святаў Музей гісторыі горада Мінска распрацаваў канцэпцыю святкавання даты першай летапіснай згадкі пра горад – 3 сакавіка. Дадзеную ключавую падзею ў гісторыі Мінска несправядліва абмінаюць у практыцы гарадскіх культурных масавых мерапрыемстваў. Галоўным гарадскім святам з 2002 г. з'яўляецца Дзень горада, які адзначаецца ў другія выхадныя верасня. Гэта час уборкі ўраджаю і перыяд, калі адзначаюцца святы, прысвечаныя Багародзіцы – нябеснай апякунцы Мінска, чый вобраз змешчаны на гербе горада.

Дата 3 сакавіка 1067 г. лічыцца днём заснавання горада. Мінск упершыню ўзгадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» у сувязі з бітвай на Нямізе. Вынікам дадзеных падзей стала разбурэнне горада: «В год 6576 … Изяслав, Святослав, Всеволод, собрав воинов, пошли на Всеслава в сильную стужу. И подошли к Минску, и минчане затворились в городе. Братья же взяли Минск, перебили всех мужчин, а женщин и детей захватили с собой как военную добычу и пошли к Немиге, и Всеслав пошел к ним на встречу. Они встретились на Немиге 3 марта; и был снег великий, и войска пошли друг на друга, и был бой жестокий, и много людей пало…» [2, с. 96–97].

Бітва на Нямізе мела глыбокі гістарычны рэзананс. Прыкладна праз 120 гадоў пасля яе аўтар «Слова аб Палку Ігаравым» наступнымі словамі ўзгадвае тыя падзеі:

Не снопы то стелют на Немиге –
Человечьи головы кидают!
Не цепами молотят – мечами!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жизнь на ток кладут и веют душу,
Веют душу храбрую от тела!
Ох, не житом сеяны – костями
Берега кровавые Немиги,
Все своими русскими костями! [3, с. 131].

Трагічнасць падзей, звязаных з першым упамінаннем пра Мінск, стала вызначальным фактарам у выбары формы рэвіталізацыі дадзенай даты. У аснову канцэпцыі музейнага свята пакладзены два супрацьлеглыя пасылы: з аднаго боку, неабходнасць узгадаць пра трагедыю бітвы на Нямізе, аддаць даніну памяці загінуўшым і разбуранаму гораду; з другога – з гэтага дня пачынаецца адлік гісторыі Мінска, яго «летапісны дзень нараджэння», што можа разглядацца як культавая падзея.

Упершыню дадзенае музейнае свята было арганізавана Музеем гісторыі горада Мінска 3 сакавіка 2016 г. і насіла назву «Летапісны дзень нараджэння Мінска». Свята спалучала ў сабе лекторый, тэатралізацыю, музычнае суправаджэнне, гульню, пачастунак для гасцей. Цэнтральнай тэмай была абвешчана бітва на Нямізе. У якасці лектараў выступалі навуковыя супрацоўнікі музея і запрошаныя вядомыя даследчыкі гісторыі Мінска, краязнаўцы, мастацтвазнаўцы, археолагі, пісьменнікі. Падзеі бітвы на Нямізе, такім чынам, былі разгледжаны з розных пунктаў гледжання: з пазіцыі археалогіі, гісторыі, літаратуры, мастацтва, краязнаўства.

У якасці месца правядзення была абрана Мінская гарадская ратуша як адзін з сімвалаў гарадскога самакіравання, галоўны гарадскі будынак. Мерапрыемства насіла некамерцыйны характар, уваход для наведвальнікаў быў вольны, па папярэдняй рэгістрацыі. Экспазіцыйная зала ратушы на нулявым паверсе здольна была прыняць 120 наведвальнікаў. Рэгістрацыя на музейнае свята была завершана праз чатыры дні пасля афіцыйнай абвесткі ў сацыяльных сетках і сродках масавай інфармацыі, што сведчыць пра высокую зацікаўленасць. Падзея атрымала станоўчыя водгукі ў наведвальнікаў.

У 2017 г. 3 сакавіка Музей гісторыі горада Мінска адзначыў адкрыццём новай экспазіцыі «Мінская конная чыгунка» на тэрыторыі комплекса былога бернардзінскага кляштара. Працягам адзначэння дадзенай даты стала інтэрактыўная музейная экскурсія-праменад «Давайце пазнаёмімся», якая адбылася на наступны дзень 4 сакавіка 2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мерапрыемства захавала свой некамерцыйны характар. Колькасць удзельнікаў абмяжоўвалася магчымасцямі аддзела музейных камунікацый. Усяго было зарэгістравана каля 120 наведвальнікаў. Галоўнай тэмай засталася бітва на Нямізе, аднак музей пашырыў свае задачы. Акрамя ўзгадкі пра гістарычную падзею быў распрацаваны новы экскурсійны маршрут па аб’ектах музея, засяроджаных на тэрыторыі Верхняга горада Мінска: Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва, арт-гасцёўня «Высокае места», Мінская гарадская ратуша, Археалагічны музей, экспазіцыі «Карэтная» і «Мінская конная чыгунка». Экскурсія пабудавана такім чынам, што паміж знаёмствам з экспазіцыямі музея наведвальнікі знаёміліся з іншымі аб’ектамі гісторыка-культурнай спадчыны Верхняга горада. Мерапрыемства ўключала тэатралізацыю, гульню, квэст і іншыя інтэрактыўныя элементы. Акрамя навуковых супрацоўнікаў да ўдзелу былі прыцягнуты клубы гістарычнай рэканструкцыі і дзіцячая музычная школа.

У трэці раз дата 3 сакавіка была адзначана ў 2018 г. Форма правядзення мерапрыемства фактычна паўтарыла музейнае свята 2016 г. Адбылося яно ў Мінскай гарадской ратушы пад назвай «Як Мінск сталіцай стаў». Галоўнай задачай мерапрыемства было паказаць месца Мінска як адміністрацыйна-гаспадарчага і культурнага цэнтра ў розныя гістарычныя перыяды. Лектарамі выступілі супрацоўнікі музея і даследчыкі гісторыі горада Мінска – супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Кожны з дакладчыкаў разглядаў пэўны этап у гістарычным станаўленні Мінска як сталічнага горада. Так, Мінск быў прадстаўлены як цэнтр княства і валасці, як цэнтр самага буйнога ваяводства Вялікага княства Літоўскага і трыбунальская сталіца, як адміністрацыйны цэнтр Мінскай губерніі, як маладая сталіца маладой дзяржавы БССР і як сталіца незалежнай Рэспублікі Беларусь. Паміж выступленнямі лектараў музей арганізаваў гульню, звязаную з атрыбуцыяй музейных прадметаў і вызначэннем іх прызначэння ў займальнай форме. Адбылася тэатральная ілюстрацыя ад клуба гістарычнай рэканструкцыі «Полацкі звяз». Акрамя таго, наведвальнікам было прапанавана разам з прафесійным салістам праспяваць старажытную народную песню «Літвін», што выклікала станоўчы водгук і высокую актыўнасць аўдыторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што музейнае свята 3 сакавіка ажыццяўляецца адпаведна вынікам тэарэтычных даследаванняў: мае распрацаваны сцэнарый, складаецца з комплекса мерапрыемстваў з інтэрактыўнымі элементамі, накіравана на папулярызацыю гісторыі горада Мінска, вырашае асветніцкія і адукацыйныя задачы.


*1.* Праздник музейный // Российская музейная энциклопедия : в 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН. – М., 2001. – Т. 2. – С. 109–110.

*2.* Радзивиловская летопись: Факс. воспроизведение рукописи / Рос. акад. наук. – СПб. : Глаголъ; М. : Искусство, 1994. – Т. 1–2. – 250 с.

*3.* Слово о полку Игореве / Пер. Д. С. Лихачева. – Калининград : Калининградская правда, 1970. – 230 с.

*4. Юренева, Т. Ю.* Музееведение / Т. Ю. Юренева. – М. : Академ. Проект, 2003. – 560 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ДИНАМИКА ХУДОЖЕСТВЕННОГО КОЛЛЕКЦИОНИРОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ


***В. Ю. Казанина,***
*аспирант Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Художественное коллекционирование – собирание предметов искусства определенного типа, имеющих эстетическую ценность: от изобразительного искусства (живописи, графики, скульптуры) до артефактов декоративно-прикладного и народного искусства. Известное с античности, оно распространилось в эпоху Возрождения в связи с открытием специфической ценности искусства, а сбор этноценностей – в связи с формированием наций. С XIV по XVII вв. в Европе появляются коллекции живописи, графики, скульптуры, костюмов, тканей, ковров, икон, изделий из стекла, украшений и т. д. Земли Беларуси не были исключением: первыми собирателями были аристократы, а внимание к художественным собраниям наблюдалось в переломные моменты истории. Исследователи-компаративисты называют три основные «культурно-поведенческие системы, порожденные искусством» и связанные между собой: художественное коллекционирование, историю искусств, художественный рынок [1, с. 105]. Про их взаимодействие в контек-